**Фразеалагізмы.** Варыянт 1

1. *Якое значэнне маюць наступныя фразеалагізмы?*

а) прыкусіць язык -

б) лахі пад пахі -

2. *У якіх сказах выдзеленыя словазлучэнні — фразеалагізмы?*

а) Ранкам пайшлі мы з братам **акунёў вудзіць.**

б) Наш дзядуля каля тэлевізара часта **акунёў вудзіць.**

3. *Запішыце фразеалагізмы, якія маюць наступныя значэнні.*

а) вельмі малога росту —

б) многа **і** цяжка працаваць —

в) вельмі хітры, ненадзейны —

4. *Замяніце выдзеленыя словы і словазлучэнні фразеалагізмамі.*

а) Бацька заўжды рабіў усё **грунтоўна**.

б) Учора мы прамоклі **наскрозь.**

в) Сёлета грыбоў у лесе **вельмі многа.**

**5.** *Знайдзіце ў тэксце фразелагізмы. Вызначце іх сінтаксічную ролю ў сказе.*

Успомнім, як бясстрашна
Уставаў за шчасце чалавек
І як шануе памяць наша
Жывое слова з веку ў век.

**Фразеалагізмы.** Варыянт 2

1. *Якое значэнне маюць наступныя фразеалагізмы?*

а) павесіць нос -

б) кату па пяту -

2. *У якіх сказах выдзеленыя словазлучэнні — фразеалагізмы?*

а) Маці **трымала ў руках** люстра.

б) Заўсёды **трымаць у руках** сябе няпроста.

3. *Запішыце фразеалагізмы, якія маюць наступныя значэнні.*

а) настойліва хадзіць куды-небудзь, просячы, дамагаючыся чагосьці;

б) вельмі блізка;

в) не дамовішся, не дойдзеш да згоды;

г) у самы бліжэйшы час.

4. *Замяніце выдзеленыя словы і словазлучэнні фразеалагізмамі.*

а) Хлапчукі трапілі з **адной непрыемнасці ў другую.**

б) Нешта апошнім часам Міколка **зазнаецца.**

в) Пачала сястрычка **адцягваць нашу ўвагу.**

**5.** *Знайдзіце ў тэксце фразелагізмы. Вызначце іх сінтаксічную ролю ў сказах.*

Цётка Хадоска перакусвала непрыкметна каля прыпечка, зводзіла вока дзе-небудзь у разоры, ды зноў бралася за працу. На руках у яе асталося шасцёра дзяцей, і яна ганарылася, што выгадавала іх, вывела ў людзі.